# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 17 ( 141 ) Аўторак, 29 мая, 1990 года

## АДБЫЛІСЯ

сустрэча камуністаў партыйнай арганізацыі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта з кандыдатамі ў дэлегаты на XXVIII з ´езд КПСС па Ленінскай выбарчай акрузе № 2, а затым галасаванне, у першым туры якога ўдзельнічалі кандыдаты ў дэлегаты К. К. Койта, А. С. Саўчык, В. У. Сяндзевіч, П. М. Сіманаў, Т. А. Чарвякова.

Па выніках першага тура галасавання ніхто з прэтэндэнтаў не набраў неабходнай колькасці галасоў.

У другім туры галасавання, якое адбудзецца 31 мая гэтага года, удзельнічаюць кандыдаты ў дэлегаты дырэктар школы-інтэрната для дзяцей са слабым зрокам Т. А. Чарвякова і начальнік упраўлення народнай асветы аблвыканкома А.С.Саўчык.

---

сустрэча камітэта камсамола Гродзенскага дзяржуніверсітэта з групай слухачоў вышэйшых камсамольскіх школ Масквы і Ташкента.

Цікавасць да гэтай сустрэчы ў камсамольцаў універсітэта была невыпадковай галоўным чынам таму, што слухачы — прадстаўнікі маладзёжных арганізацый афрыканскіх краін.

Перад прадстаўнікамі моладзі замежных краін выступілі прарэктар па вучэбнай рабоце універсітэта С. А. Габрусевіч, сакратар партыйнага камітэта У. К. Пчэльнік.

Гасцей цікавілі адносіны адміністрацыі ВНУ і маладзёжных арганізацый — ці бываюць канфлікты, як вырашаюцца спорныя пытанні, што часта ўзнікаюць у жыцці, асноўныя напрамкі дзейнасці маладзёжных арганізацый, ці ёсць ва універсітэце апазіцыя камсамольскай арганізацыі.

Хацелі яны пачуць і аб адносінах да падзей, якія адбываюцца зараз ва Усходняй Еўропе, у Савецкім Саюзе, да праблемы студэнцкага руху.

У цэлым можна адзначыць шчырасць размовы. Не было імкнення пазбягаць вастрыні і праматы ў пытаннях і адказах.

---

чарговае пасяджэнне камітэта камсамола, дзе была разгледжана персанальная справа студэнта 3 курса факультэта правазнаўства **А. Луканскага.**

Большасцю галасоў за неаднаразовае з ´яўленне ў грамадскіх месцах у нецвярозым стане А. Луканскі быў выключаны з членаў ВЛКСМ.

Камітэт камсамола хадатайнічае перад рэктаратам аб адлічэнні Луканскага з універсітэта з правам узнаўлення.

## АНОНС!

**«Н. Д. Беспамятных известен своими научными работами по истории математики и математического образования (ныне он принялся за исследование по истории математики и математического образования Белоруссии и Прибалтийских республик).**

**Его общая подготовка, высокая математическая культура, исследовательские навыки по работе в архивах над рукописями дают полное основание быть уверенным, что он даст хорошее исследование по актуальной теме...»**

**У гэтым нумары газеты змешчаны цікавы матэрыял аб Н. Д. Бяспамятных, яго нарысы, назіранні, разважанні. Думаецца, пазнаёміцца з імі будзе цікава не толькі матэматыкам, працаваўшым разам з Нікіфарам Дзмітрыевічам, але і студэнтам, будучым настаўнікам.**

## *Увага: конкурс завершаны. Сардэчна віншуем переможцаў!*

**Аўтарытэтная камісія ў складзе 9 чалавек пад старшынствам дэкана філфака Тамашэвіча Т. І. разгледзела шматлікія матэрыялы, пададзеныя на конкурс (каля 70 адзінак), і пастанавіла:**

**лічыць пераможцам агульнауніверсітэцкага літаратурнага конкурса студэнта 4 курса завочнага аддзялення філалагічнага факультэта Юрася ПАЦЮПУ. Прысудзіць яму грашовую прэмію ў размеры 100 руб.;**

**прысудзіць другое месца з уручэннем грашовай прэміі па 70 рублёў кожнаму: студэнту 3 курса стацыянара гістарычнага факультэта Едрусю МАЗЬКО і Андрэю ПЯТКЕВІЧУ;**

**прысудзіць трэцяе месца з уручэннем грашовай прэміі па 45 руб. кожнаму: студэнту 4 курса стацыянара фізічнага факультэта Ігару ЗАЎЯЛАВУ, студэнту 4 курса завочнага аддзялення філалагічнага факультэта Юры КАРЭЙВУ, студэнту 1 курса стацыянара філалагічнага факультэта Юрыю ГУМЕНЮКУ;**

**заахвочвальнай прэміі не прысуджаць.**

**Віншуем пераможцаў конкурса і жадаем ім новых творчых поспехаў.**

**Літаб ´яднанне «Наднёманскія галасы».**



НА ЗДЫМКУ: свае вершы чытае Ю.Пацюпа, пераможца конкурса.

## *ГІСТОРЫКІ НА «ТЫДНІ НАВУКІ — 90»*

Ужо стала добрай традыцыяй праводзіць красавіцкія навуковыя канферэнцыі ў перыяд Тыдня гістарычнага факультэта. У гэтым годзе ён пачаўся 23 красавіка сустрэчай з выпускнікамі гістфака розных гадоў. 25 красавіка адбылося пасяджэнне выкладчыцкага прэсклуба. Студэнты задавалі дзесяткі пытанняў сур ´ёзных і жартоўных сваім выкладчыкам, і трэба было бачыць, якія намаганні неабходна часам прыкласці, каб адказаць з гумарам ці сур ´ёзна. Былі пытанні аб асабістых норавах і густах, аб каханні і дружбе, аб працы і адпачынку. Адбіўшы атакі студэнтаў, выкладчыкі ўмела перавялі прэсклуб у больш прывычнае для іх рэчышча і пачалі самі задаваць пытанні. Думаю, што пасля гэтай сустрэчы студэнтам стануць больш блізкімі і зразумелымі іх выкладчыкі.

Дзень 26 красавіка пачаўся пленарным пасяджэннем «Дня навукі». У гэтым годзе была праведзена сумесная канферэнцыя выкладчыкаў і студэнтаў. На пленарным пасяджэнні з цікавымі дакладамі выступілі прафесары М. В. Жарскі і Я. Н. Мараш. Яны адказалі таксама на шматлікія пытанні. Таваразнавец магазіна «Праметэй» Т. Ю. Антропава пазнаёміла прысутных з навінкамі гістарычнай літаратуры і тэмпланамі выдавецтваў на 1991 год. Затым засядалі пяць секцый: крыніцазнаўства і гістарыяграфія, праблемы гісторыі БССР, гісторыя гарадоў і сёл Гродзеншчыны, краязнаўства, праблемы ўсеагульнай гісторыі. Там выступіла каля 60 студэнтаў і выкладчыкаў. Лепшыя былі ўзнагароджаны граматамі і грашовымі прэміямі: Мілевіч І. П., Даніловіч Л. Д., Семекчык М., Барэйша Д. Д., Пятрэвіч А. З. і іншыя.



27 красавіка адбылася навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 35-годдзю факультэцкага гісторыка-краязнаўчага гуртка прафесара Я. Н. Мараша. Вялікую цікавую і плённую работу праводзіць гэты гуртор. Яго выпускнікі і цяперашнія ўдзельнікі (каля 45 чалавек) выступілі на канферэнцыі.

Закончыўся «Тыдзень навукі-90» факультэта медыумам. Чацвёрты курс папрацаваў на славу і перапоўненая глядзельная зала атрымала задавальненне ад гумарыстычных вершаў, ад гумарыстычна выкананых сцэн з жыцця студэнтаў і работы выкладчыкаў, ад цікавага дыялога вядучых. Малодшым курсам было чаму павучыцца.

**В. ШВЕД,**
**нам. дэкана гістарычнага факультэта па навуковай рабоце.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнты гістарычнага факультэта, актыўныя ўдзельнікі «Тыдня навукі-90» (злева направа) Павел Лучыц, Віктар Белазаровіч, Міхаіл Каско з Таццянай Аляксееўнай Бадзюковай, кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам у час чарговай творчай размовы.**

## з дня нараджэння Н. Д. Бяспамятных



Н. Д. Беспамятных

# С МЫСЛЬЮ ОБ УЧИТЕЛЕ

*(очерки)*

**В научном архиве Н. Д.Беспамятных имеются нигде не опубликованные «Очерки об учителях». Всего очерков — четыре. Они написаны, по-видимому, в 70-е годы и представляют собой воспоминания Никифора Дмитриевича о его учителях по Сарафановской начальной школе, Покровской семилетней школе и Алапаевской школе II ступени. В этих школах Свердловской области автор проходил обучение в период с 1918 по 1930 год.**

...Большим несчастьем для детей — учеников школы, а, следовательно, вредным для дела образования, является практика частой смены учителей. Надо создавать все условия, чтобы учитель работал на одном месте многие годы. Другой учитель для ребенка — большая травма. Ведь говорят же, что учительница — вторая мать для ученика, и это верно. Потеря матери — — ни с чем не сравнимое горе, потеря второй матери — учительницы — тоже в сильной степени травмирует ребенка. Если ребенок полюбил первого учителя, то второго полюбить — это неестественно, он даже может его ненавидеть...

При первом знакомстве ученик не столько слушает учителя, сколько изучает его. Он обращает внимание на внешность учителя, его поведение, реакции, речь, характер, эрудицию и даже умственный багаж. Делается это в значительной степени подсознательно, и объясняется не только простым любопытством, но и чувством самосохранения, так как ему предстоит длительное общение с учителем при условии подчинения своей воли; зреет чувство антипатии или симпатии к учителю...

«Относительно того, как держать себя на первом уроке, вряд ли говорится в педагогике. Однако вопрос не праздный, к первому уроку надо готовиться особо. От него зависят контакты с учениками, по крайней мере, в первое время. Возможны всякие случаи, в том числе и самые крайние. Иной новичок старается понравиться ученикам. Для этого существует достаточно много приемов: строгость, эрудиция, внешний вид и т. д. Это желание естественное, но надо, чтобы оно проявлялось в естественных формах.

Поведение на первом уроке бывает очень робкое. Иногда эту робость приписывают слабой подготовке учителя. Но это не всегда верно. Встречаются очень знающие учителя и, тем не менее, на первых уроках теряются. Со временем эта робость проходит. Это свойство характера не воспринимается учениками дурно. Но, как ни странно, (в противоположность робости) воспринимается, по крайней мере в первое время, положительно. В дальнейшем происходит корректировка взаимоотношений учителя и учеников по мере того, как раскрываются другие качества учителя. Вероятно, лучше всего воспринимается такое поведение учителя, при котором он не дает почувствовать ученикам, что он первый раз в классе, и ведет урок нормально или слегка настороженно. Вообще коммуникативные качества учителя составляют важный элемент в его профессиональной подготовке, от них в известной степени зависит и успех работы...

...В дополнение к другим положительным качествам правильное использование учителем голосовых средств несомненно благоприятным образом сказывается на эффективности занятий...

...Отношение учителя к ученикам может быть разнообразным. Одни держатся отчужденно, холодно, безучастно, другие даже заискивают перед учениками. У некоторых наблюдается при серьезном разговоре с учениками шутливый тон. Но, по-видимому, чаще все же отношение учителя к ученикам серьезное. И эта серьезность уживается с отзывчивостью, иногда скрытой под вуалью, отчужденностью...

...Все учителя обращались к нам на «Вы» и называли не по имени, а по фамилии. Нам показалось бы в высшей степени странным, если бы учитель вдруг обратился к нам по имени или с невежливым «ты»... Нас такое обращение, безусловно, шокировало бы. Принятым отношением утверждалась как бы граница между учеником и учителем, которую нельзя было перейти. Эта граница сохранялась той и другой стороной. По моему убеждению, таким обращением подчеркивалось человеческое достоинство в каждом ученике. Так обстояло дело в старших классах Алапаевской средней школы, которую я заканчивал, так обстояло дело и в высшей школе. Я не помню, чтобы кто-то из преподавателей обратился ко мне (или другому студенту) на «ты». Было только одно исключение. Один из ассистентов — математиков не признавал другого обращения, кроме как «ты». Так он обращался и к пофессорам. Но такое обращение он допускал и к себе. Особенно неприятно наблюдать такое явление: декан или преподаватель говорит студенту «ты» и считает это в порядке вещей, но студент не может к нему обратиться на «ты». Это уже неравенство, вытекающее из более высокого положения одних, более низкого — других. Это уже несправедливо с моральной точки зрения, а вообще-то просто некультурно.

Не бытовал термин и «ребята». Не могу сказать вообще, буду иметь в виду только наш класс. Правда, по возрасту мы были старше современных своих одноклассников года на три. Учителя относились к нам, как к взрослым... И требования к нам были также серьезными, как ко взрослым.

Мы относились с полным уважением к своим учителям, они платили нам тем же. Это не значит, что мы за шалости не получали выговоры, и нас не выставляли за дверь.Впрочем,это было редко... Я бы сказал, что в наше время существовал культ учителя. Учитель — нечто недосягаемое для нас, образец во всех отношениях. Мы подражали им, копировали, строили себе идеалы...

... В Коллективе учителей средней школы всегда есть преподаватели, которые оказывают решающее влияние на учащихся. Под этим влиянием ученики выбирают себе профессию, определяют свой житейский путь. Эти учителя возбуждают интерес к науке и оказывают решающее воздействие на формирование мировоззрения и поведение. Было бы большой трагедией для школы, если бы школа таких учителей не имела.

Это положение надо понимать, очевидно, так. Из общей массы учителей выделяется несколько личностей, которые в этом отношении играют главную роль. Вероятно, в данном вопросе играет интерес к предмету и особо привлекательные черты педагога (его эрудиция, порядочность, творческий подход к работе и научный интерес и т. д.). Я не буду входить в эти вопросы педагогики, но отмечу, что некоторые из учителей не оставляют следа в формировании учащихся как личностей: одни по краткости общения, другие — по своей духовной бедности. Понятно отсюда, что частая смена учителей школы отрицательным образом сказывается на воспитании учеников...

...Понятие «владеть классом», видимо, в мое время не существовало. Классы были небольшие, ученики из деревни — скромные, послушные. Нарушения были, кажется, совсем несущественные. Например, не приведена в порядок доска, нет тряпки, ученик забыл книгу или тетрадь, ученик не может решить задачу или дать ответ учителю на его вопрос. За все эти недостатки ученики получали «полный разнос». Домашнее задание выполняли полностью. Например, задачи из задачника по алгебре Шапошникова и Вальцева, а также по геометрии Рыбкина прорешивали почти полностью...

...Вежливость — неотъемлемое качество хорошего учителя. Если это качество отсутствует у учителя, то оно едва ли может быть чем-нибудь компенсировано...

...Вторая черта, которая не должна быть свойственна учителю — это чувство мщения. Если человек мстителен, то он уже не учитель.

...Если мужчина идет с дамой, то он всегда должен быть на какую-то долю шага позади ее. Почему? Те приветствия, с которыми Вас встречают знакомые, должны относиться прежде всего к даме. Но как только Вы подходите к двери, то Вы, не суетясь, опережаете ее, открываете дверь и даете пройти сначала даме, а потом входите сами.

Правило простое, но оно осталось на всю жизнь. Иногда поражаешься отсутствию элементарного чутья у мужчин, как надо себя вести. Часто встречаются такие ситуации. Вы входите (или выходите) в помещение, но [illegible]

ной. Естественно, Вы даете возможность ей пройти, но за ней шел мужчина (пусть это даже супружеская пара!), и этот мужчина, видя, что Вы пережидаете, когда выйдет женщина, устремляется за ней. Если это был супруг или кавалер, то непременно должен поблагодарить Вас. Но этого Вы никогда не услышите. Это более элементарно, чем таблица умножения или простейшие грамматические правила письма. Элементарная вежливость, такт, совершенно необходимые элементы культуры...

...Раболепие, заискивание, нравственная нечистоплотность вызывают у ученика отвращение к учителю, даже брезгливость. Ученик непременно строит себе идеал. Это естественно. Идеал формируется не сразу, это формирование по меньшей мере проходит в два этапа: сначала на интуитивной, а затем и на сознательной основе. Начальная ступень представляет собой несложную идеализацию черт вполне реального человека, с которым ученик находится в общении, в данном случае черт своего учителя... На последующем этапе выступает более сложная идеализация...

...Нередко можно услышать от пожилых людей упреки в адрес молодежи, что она непочтительна к своим учителям. Но были ли лучше сами? На этот вопрос всегда отвечают утвердительно: да, значительно лучше, наше отношение было благоговейным к своим наставникам. В этом я не вижу ни лжи, ни правды. Парадоксально? Нет. Я объясняю это явление «психологическим налетом», который образуется с годами. Уважение к учителям, как правило, приходит позднее, и нам кажется, что мы и в ученические годы относились к ним с таким же теплым чувством, которое испытываем сейчас при воспоминании, то есть спустя несколько десятков лет. В отроческие и юношеские годы наше отношение к учителям можно назвать безотчетным. Я не утверждаю, что это положение является всеобщим, но в какой-то степени оно отражает действительность.

Собственно, в пожилом возрасте мы думаем о своих учителях мгновениями, не останавливая особого внимания на них и не выражая должного уважения к их памяти. У кого из нас в ряду семейных и прочих фотографий имеется особая фотография учителя? Кто из нас рассказывает своим детям или внукам, какие у нас были замечательные учителя, руководствуемся ли мы теми наставлениями, которые они внушали нам, когда мы были молодыми?

... Педагогическая литература двадцатых и тридцатых годов говорила о старом учителе в негативном смысле. Это обстоятельство, несомненно, сыграло свою отрицательную роль в отношении к учителю. У нас нет, к сожалению, культа учителя.

Может быть труд учителя такой мизерный и ничтожный, что не следует о нем говорить и, тем более, сохранять о нем память? Я бы не сказал, что труд учителя героический, как иногда его квалифицируют! Это не труд военного командира, космонавта, летчика, капитана дальнего плавания, полярника и т. д. Эти профессии действительно требуют таких черт характера, как мужество, смелость, решительность, отважность, быстрая ориентировка в сложных ситуациях. Учитель может не иметь этих качеств и тем не менее быть хорошим учителем. Его труд весьма скромный и черновой. Черновой потому, что он завершает большим и тяжелым трудом первый этап формирования человека и подготавливает [illegible]

совершенствования.

Величие труда учителя заключается в другом, а именно в том, что он готовит людей ко всем профессиям и героическому труду, он воспитывает такие черты характера учеников, как настойчивость в достижении цели, чувство долга, ответственность, способность мыслить научно, творчески решать практические задачи. Школа проводит и такие мероприятия, которые требуют от учащихся и смелости, и даже храбрости...

...Одна из главных черт, которой должен обладать учитель и без которой он перестает быть учителем, заключается в проявлении способности к разносторонней и развитой научной мыслительной деятельности, в проявлении постоянной и органической потребности к этой деятельности. Учитель, не обладающий в должной мере этим качеством, не сможет воспитать у учеников научное мышление и потребность в этом мышлении. Воспитание научного мышления и соответствующего ему отношения к действительности составляет главную задачу учителя, как и профессора. Теперь много говорят о воспитании мышления, по математике — логического мышления. Это верно, но не все. Задача учителя заключается в постоянной потребности в научном мышлении. Это главное, на мой взгляд. Следовательно, этой чертой учитель должен обладать сам. Рядом с этой чертой учитель должен поставить нравственность и интеллигентность. При этом условии учитель будет со всей полнотой положительного ... воздействия влиять на воспитание учащихся...

...У меня сложилось такое мнение, что мужчины оказывали на мальчиков большее влияние, нежели женщины. Что касается учительниц, то я был не одинок в той мысли, что они слабее справлялись со своей педагогической работой. Были, конечно, исключения. Я слушал их только потому, что был по природе дисциплинированным учеником. Мальчику для формирования идеала, конечно, нужен учитель мужчина, а не женщина. Для девочек, само собой разумеется, наоборот. Идеал формируется не сразу, а проходит ряд ступеней и отвлекается от конкретных личностей, с которыми он общается, в данном случае с учителем. Женщина слишком много опекает учеников. Мужчина говорит меньше, он одним взглядом прижимает ученика к его месту в школе и заставляет работать. Конечно, среди тех и других, очевидно, есть разные. Я говорю о конкретных (своих ) наблюдениях...

...К конкуренции со мной никто не стремился. Класс был очень дружен. Желаний выделиться перед классом, перед учителями у нас не было. Это чувство не воспитывалось, осуждалось. Можно было получить кличку «академ-кулак». Однако считаю, что чувство соревнования, желания быть лучше других в каком-то отношении, развитое в меру, есть здоровое чувство, и оно должно руководить учениками в их занятиях. Оно не унижает других, так как другие тоже могут стремиться к тому, чтобы заявить о себе в какой-то другой полезной области. У каждого должен быть свой любимый предмет, пусть даже не из школьных, и эту любовь надо всячески поощрять.

Опасна серость во всем, отсутствие стремления знать больше и делать больше. Учителю надо следить за индивидуальными склонностями учеников, видеть, чем выделяется каждый из них и делать поощрения...

# ЛІТАБ'ЯДНАННЕ «Наднёманскія галасы»

## *Непатрэбны тэкст, або папярэдняе тлумачэнне*

Самая няўдзячная справа — тлумачыць вершы, асабліва, калі чалавек, нягледзячы на ўсе намаганні прамоўцы, аніяк не ўцямяшыць, што паэзія можа абыходзіцца без рыфм і без памераў. Чым жа, маўляў, яна тады розніцца ад прозы!

Тэкст — тканіна са слоў, кнот, апушчаны ў вадкасць трансцэндэнтнага, а на другім канцы тэксту запальваецца агеньчык сэнсу. Сэнс утвараюць любыя элементы, плюс «адносіны», «зазор», напоўнены вакуумам як трансцэндэнтным. Возьмем найпрасцейшае, назоўнікі, і адносіны паміж імі, працяжнік. Затым замест містычнага працяжніка можна паставіць дзеяслоў, ён складанейшы, але і больш просты, бо акрэслены, а працяжнік — гэта нуль раўняецца бясконцасці. Нездарма ж некалі В. Шэршэневіч адмовіўся ад дзеясловаў. Яны прыводзяць да нечага адзінага, пэўнага. Карацей кажучы, канструяванне свету ў паэзіі адбываецца на ўзроўні слова, а не сказа, як у прозе, хаця ўжо і самая элементарная схема, прыведзеная намі, імкнецца ўкласціся ў граматычную структуру. Верш, вонкава пазбаўлены апошняе, можа мець ускладненыя рознымі нюансамі адносіны паміж элементамі, «мутацыі» рэчаіснасці, таму яго нельга непазбежна заганяць у пракруства ложа граматыкі.

Акрамя таго, пэтычная мова мае дыскрэтна-хвалявы характар: радкі, строфы і маўленчая плынь (з імкненнем да граматычнае структуры). Манады і субстанцыя. Але сутнасць мовы не можа быць зразумелай у адрыве ад паэзіі як такавой. Іх можна разарваць на практыцы, але яны маюць агульнае паходжанне ад эмацыянальных, некамунікатыўных гукаў жывёл.

Мне скажуць, што пры такім падыходзе чытачу можна прапаноўваць і незвязаны набор слоў або сказаў? А як жа! Мы мыслім не толькі звязана. І няўжо лепш псеўдафальклорныя рыфмаванні а ́ля родны кут? Дрэнныя вершы непазбежны пры любых творчых установах.

Усё гэтае зусім не значыць, што я супраць нацыянальна-адметнага мастацтва. Наадварот, кананізацыя прымітыўных, вонкавых атрыбутаў і вядзе да інфляцыі слова. Мяркую, аднабакова было б зазначыць у сусветным культурным працэсе толькі інтэграцыю структур нацыянальнага без адваротнага працэсу. Інакш нас чакае анігіляцыя, залатое мёртвае мора. І тут вельмі шкодная прымха пра нейкае, быццам будучае, касмічнае існаванне чалавецтва. Яно заўсёды было касмічным, не менш як у любой аддаленай будучыні.



**НА ЗДЫМКУ: рабочы момант — у пошуках вобраза.**

Сёння, у сувязі з крызісам постмадэрнізму актуалізуецца гетэрагеннасць этнаграфізму ў сінтэзе з эратычнасцю авангарду.

Я свядома шукаю беларускія архетыпы і формы ў гарызонце ўсяе культуры, ад эпічнага, шматколернага гераізму да мазаічнай анекдотнай свядомасці, складзенай з мноства асклепкаў... Што да менавіта беларускіх адметнасцей, то можна сказаць: мы і зараз немалая рэспубліка, а некалі былі магутным княствам, ад мора да мора. Гэта не магло прайсці без следу. Мы не жыхары малога небагатага краю, «нам ёсць што піць, з падмосткаў ліць» (У. Караткевіч). У нас шыр — і гэтым мы падобныя да рускіх, але толькі вонкава. Нашая шыр якасна іншая, супрацьлеглае рускай, яна з межамі, яна дыскрэтная, не качэўная. На беларускую ментальнасць наклалі адбітак адсутнасць буйных гарадоў, наяўнасць маленькіх, але развітых і гарманічных мястэчак з надзвычай моцным гэбрэйскім элементам. У адрозненне ад рускае, дэспатычнае манархіі, мы мелі шляхецкія вольнасці, і таму ў нас супрацьлеглы характар свабоды. Нашы абсягі заселеныя — і мы больш ашчадныя. Мы мелі нябачаную нідзе рэлегійную талерантнасць, але ў нас не ўтварылася моцная нацыянальная рэлігія, і , магчыма, таму найбольш захавалася язычтва. Усё вышэй пералічанае не магло не пераліцца ў сістэму нацыянальных архетыпаў.

Калі ж гаварыць пра сучасную літаратуру, то праз яе, як сусветная трэшчына праз сэрца паэта, праходзіць праблема сацрэалізму, але яна патрабуе асобнага разгляду.

**Ю. ПАЦЮПА.**

## Юрась Пацюпа

### «ВЫБРАНЫЯ ШТУДЫІ»

#### 1.Дрэва

Я павісну расколатым яблыкам,
надвая ў белым свеце раздзелены,
мне зімою за шыбаю ззяблаю
відно дрэва, што ў ціхай шэрані:
узіраецца ў неспакойнага
(Што яму гэты бег мой спрадвечны!),
разрывае каменне коранем,
пахне ў небе цвіценнем млечным.

1986.

#### 2.Каларадскія жукі

...І вузкая дарога нас вяла,
паўзлі жукі. Я помню: пад нагамі
падэшвы ажываюць, а зямля
трашчыць — жукоў, нібы цвікі, ўганяю.
Асенні свет, скрозь яблыкі, як сонцы,
з палёў жукі, іду адтуль і я;
нібы пытанне, цішыня бясконцая:
чый гэты свет, чаму трашчыць зямля?

1986.

#### 3. Сон І

Сон таўкуць камары,
ён расцякаецца па траве
І крадзецца ў вочы сутонне
хіслае
як вастрыё голкі сон,
зайходзяць у вочы ў пальцы
шматлікія ценякі,
сон запаўняе шыбы,
белым робіцца шкло
ціхае, як сутонне
сон, неба
прымроілася траве — яны
сон

1987.

#### 4. Бурштын

Бурштын бясконцы на далоні,
І ты ў бясконцасці стаіш,
святло ж глыбінь яго далёкіх
над морам разгайдае сціш.
Вось над табой знікае сонца,
і боль, як быццам бы не твой,
ты — у чужым бары сасонкай,
твой галамень цячэ смалой,
сцякае сонца промнем зманным,
пульсуе мора чорным дном,
і ў белым свеце дыямантным
твой снег бясконцы за акном.

1988.

#### 5. Сон пра Маякоўскага

Сон
глістом
запаўзае
ў вуха...
спаміж восенню
і зімой.
На тым свеце
ёсць пара года
анідуха —
і Сусвет ператвараецца
ў англійскі замок.
Унізе колеры
бела-
чорныя,
калі праз неба
што пеклам закурана,
гледзячы-
адно павукі там,
падобныя да Кручонага
і вірусы,
што як нуль
не дзеляцца.
У парку
раскрыжаваныя трупы,
Спяць на лаўках забойцы,
адрэзаныя галавы —
пад голаў,
Між зямлёю і цвердзю
блакітным
слупам
укамянее голас.
Згрызуць
мышы
дарэшты
сябе
аб Ваш голас,
высока ў жудасным не —
бе
запальваюцца зоры
голыя.
А ў паэтаў —
ісціны голыя,
за душой
ані ломанага дня,
ані чорнага каменя...
Ці пішацца
аб Чарнобыле,
ці ёсць у чым
раскаяцца?
Ав оуо
нараджаецца Эстонія,
ад нуля
Русь
Белая...
І ступаюць Вашы радкі
чырвоныя
на маўчанне
працяглае
белае.
Сны
запаўзаюць у шчыліны
чарнейшыя ад кузак,
горкія,
бы дні народныя...
Вы ведаеце —
паэт можа
нічога не казаць,
калі маўчанне будзе
праўдаю.

1988.

## ІГАР ЗАЎЯЛАЎ

Вечером тихим над крышами хат
Красные листья роняет закат.
Словно взбежало на взгорок село,
В окнах зари золотое стекло.
Грустным цветением дол опален,
В золоте тонут и липа и клен.
Твой оброненный случайно там взгляд
Нежно хранит в саду листопад.
Кто-то родился здесь, кто-то здесь рос...
Сумерки плачут у белых берез.

1987.

Поднялась луна большая,
Разлила зеленый свет,
За садами, не смолкая,
По прудам звенит концерт.
Потонул овраг в тумане,
Позади остался дол,
Как на тайное свиданье
К нашей хате я пришел.
Всюду заросли сирени,
В белый цвет усыпан двор,
Пахнет сыростью весенней
Покосившийся забор.
Неуютно, одиноко,
Словно нас на свете нет,
Лишь глядят пустые окна
На дорогу много лет.
Здесь давно не проживают,
И меня из этих мест
За деревней провожает
Придорожный старый крест.

1990.

Там, где бродишь, околдован,
Где нора в овраге лисья,
Обмирая в танце новом,
Закружились с ветром листья.
Еле слышно, чуть заметно,
Облетают клен и ясень.
Лес осенний тих и ясен,
Обрамлен закатным светом.
Помню, в солнечной оправе
Высоко плескалась зелень,
А теперь кругом лишь травы
Под листвою той осели.
А теперь в лесных покоях,
Где гуляем я да ветер,
Кто-то щедрою рукою
паутин развесил сети.

1987.

Теряют дни привычное обличье,
Повсюду снега тающий покров,
Повсюду шум, повсюду перекличка
Веселых деревенских петухов.
Шумят водой овраги и лощины,
Но спит еще в сугробах белый сад,
Лицо полей изрезали морщины,
Глаза из луж печальные глядят.

1987.

Хочу любить — ничто мне не мешает,
Хотел воспеть, но только расскажу
Красу земли, где вёска небольшая,
Что крайней хатой ткнулася в межу.
Ее в холсты не впишет масло красок,
Зато легко раскроет акварель.
Здесь резкий звук выслушивать напрасно,—
Звучанья полнит краткая свирель.

1986.

Вот и все. Распрощалася взмахом крыла
Стая птиц, догоняющих лето.
Бродит дождь за окошком один вдоль села,
По стеклу барабанит с рассвета.
Вот и все. А, казалось, не будет конца
Кавалькадам безоблачных дней.
Закрываю плотнее я двери в сенцах,
С каждым днем холодней, холодней.

1986.

### ВЕСЕННИЙ САД

Не зря, не зря ты вновь, живой и нежный,
Оделся в свой мечтательный наряд!
Таким, о сад, люблю тебя, конечно,
Теперь ты мне как лучший друг и брат.
Окно открою — ты глядишь, приветлив,
Качая белокурой головой.
Маши, шуми во всю листву и ветви,
Я слушать не устану голос твой!
Как не любить беспечность лепетаний
Зеленых губ, когда, роняя цвет,
Дорогу в осень стелешь лепестками,
Не зная, что иной дороги нет.
Плоды свои развесив прямо в небо
Прекрасен ты, но мне милей весной,
Раскрыл окно — и, словно год здесь не был,
И пьян отравно свежей белизной!

1986.

Ты помнишь, роняли как ветви
К ногам лепестковую грусть,
Как ты рассмеялась в ответ мне,
Как я обещал, что вернусь?
Ты помнишь, на склоне у вишни
Янтарная стыла слеза,
А ветви клонились все ниже,
Чтоб цветом глядеться в глаза?
Не скоро разлуки срок вышел,
Не мне улыбнулась судьба,
Улыбчивость вызревших вишен
Застыла в красивых губах.
Прости, а за что, я не знаю,
За то ли, что вновь сад цветет
И призраком белым по маю
Разносит дурманящий мед!

1985.

Отхолодало. Скоро осень
Покинет здешние места.
Зари осыпались колосья
В земли остывшие уста.
И воронья крикливый рокот
Кружит в безмолвии зари,
Когда в притихшую Европу
Снегами движется Сибирь.

1987.

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшка, 22, пакой 404,
тэл. 44-80-70

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня
вул. Паліграфістаў, 4.

Тыраж 2000 экз.
Зак. 4586
АИ 05161

Рэдактар
Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.